Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта
намеснік Міністра адукацыі

_______________Р.С. Сідарэнка

«18» снежня 2018 года

# ТРЭЦІ ЭТАП XXXV РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

**10 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Варыянт І**

**Заданне 1.** У табліцы пададзены восем слоў, у кожным з якіх прапушчана адна з трох літар – ***е***, ***ё*** або ***я***. Вызначце гэтыя літары і запішыце іх у слупку справа насупраць адпаведных ім слоў.

*Максімальная колькасць балаў – 4* (**0,5** бала – за кожны правільны адказ).

| | | | |
|---|---|---|---|
| *рады…вузел* | | *рады…хімія* | |
| *сяб…любства* | | *рады…актыўнасць* | |
| *галал…дзіца* | | *аўды…прадукцыя* | |
| *л…даўборачны* | | *плац…жаатрымальнік* | |

**Заданне 2.** У левым слупку табліцы прыведзены фрагменты шасці фразеалагізмаў. Дапоўніце кожны з іх прапушчаным кампанентам, кіруючыся змешчаным побач значэннем фразеалагізма. Запішыце гэты кампанент у патрэбнай граматычнай форме ў трэцім слупку адпаведнага радка. Прапушчаныя кампаненты ўсіх фразеалагізмаў па форме павінны быць суадноснымі з прыметнікамі, сярод якіх, паводле свайго першаснага значэння, па два якасныя, адносныя і прыналежныя.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| | | |
|---|---|---|
| як … труба | *‘вельмі гучна, моцна (грымець, крычаць і пад.)’* | |
| за … свет | *‘вельмі далёка (накіроўвацца куды-н.)’* | |
| снегу … не дапросішся | *‘хто-н. страшэнна скупы’* | |
| гнуць у … рог | *‘строгасцю, уціскам прымушаць пакарыцца, падпарадкавацца’* | |

| | | |
|---|---|---|
| … гняздо | *'прыстанішча, зборышча небяспечных, шкодных людзей'* | |
| станавіцца на … дарожку | *'пачынаць дзейнічаць ненадзейным, небяспечным спосабам'* | |

**Заданне 3**. Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Вторую неделю весь воздух был насыщен дымом; где-то горела тайга. Солнце стояло большое, кровавое, как докрасна накаленный медный шар. Резкие тона и очертания в ландшафте сгладились, расстояние стало обманчивым, неверным: близкое стало далеким, далекое приблизилось вплотную. Воздух был неподвижен. Сквозь молочно-голубую дымку мутно голубело все кругом: лес, скалы, острова – все тускло, призрачно *(По В. Шишкову).*

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

**Заданне 4.** Устанавіце адпаведнасць паміж вытворнымі словамі і спосабамі іх утварэння. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў.

*Максімальная колькасць балаў – 4* (**0,5** бала за кожны правільны адказ)

| | |
|---|---|
| **А.** Звышнатуральны | **1.** Суфіксальны |
| **Б.** Бясстрашны | **2.** Прыставачны |
| **В.** Падказка | **3.** Прыставачна-суфіксальны |

| | |
|---|---|
| **Г.** Падкоп<br>**Д.** Медкаледж<br>**Е.** Маланаселены<br>**Ж.** Вагонарамонтны<br>**З.** Хто-небудзь | **4.** Складана-суфіксальны<br>**5.** Бяссуфіксны (нульсуфіксальны)<br>**6.** Постфіксальны<br>**7.** Асноваскладанне<br>**8.** Словаскладанне<br>**9.** Абрэвіяцыя |

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: ______________________________________________

______________________________________________________________

**Заданне 5**. Сярод часцін мовы даволі пашыраныя з'явы граматычнай аманіміі і мнагазначнасці, а таксама ўзаемапераходу. Гэта характэрна як для самастойных, так і для службовых часцін мовы, з чым нярэдка звязаны цяжкасці іх марфалагічнай і сінтаксічнай характарыстыкі.

Запішыце, якімі часцінамі мовы і членамі сказа з'яўляюцца выдзеленыя словы ў прыведзеных прыкладах?

*Максімальная колькасць балаў – 4* (**0,25** бала за кожны правільны адказ)

1) **Хоць** лютуе люта люты – неба яснііцца вакол. 2) Я хачу **хоць** на хвіліну пабачыць тыя мясціны. 3. Слава палкім байцам, **хто** за волю Радзімы загінуў! 4) **Хто** збіраецца паехаць на экскурсію? 5) Граматычны лад мовы такі, **што** дазваляе выказаць любую думку. 6) Зацвіла каліна, **што** мы пасадзілі мінулай вясной. 7) Цяжка было ўявіць, **як** пройдзе гэтая трывожная ноч. 8) Ручай гэты, **як** і рэчка, выцякаў з вялікага лесу.

| № п/п | Часціна мовы | Член сказа |
|---|---|---|
| 1. | | |
| 2. | | |
| 3. | | |
| 4. | | |
| 5. | | |
| 6. | | |
| 7. | | |
| 8. | | |

**Заданне 6**. Запішыце тэкст, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. У перадапошнім сказе вызначце колькасць сэнсава-граматычных частак.

*Максімальная колькасць балаў – 5*
(з іх **1** бал – за правільнае вызначэнне колькасці частак
у складаным сказе; за кожную памылку здымаецца **0,5** бала)

Малая радзіма гэта абсяг нашага дзяцінства гэта тое што могуць бачыць дз*(я,і)*цячыя вочы і што прагне *(у)* вабраць у сябе чыстая шчырая душа. Малая радзіма там дзе гэтая душа *(у)* першыню здзівілася ўзрадавалася і аж за*(й)*шлася ад шчасця і дзе *(у)* першыню засумавала або перажыла сваё першае ўзрушэ..е.

Ціхая вуліца ма*(т,ч)*чын агародчык які запрашае цягне да сябе каб пачаставаць самымі смачнымі в..сковымі ласункамі морквяю агуркамі бобам. Сад дзе вісне з яблын*(ь)*

цыбул..вымі пл..цёнкамі гал..ё з чырв..набокімі яблыкамі. За садам духмяны абшар поплав*(а,у)* да якога хоч..цца як у дзяцінстве *(на)* перагонкі пабегчы і бухнуцца там у аз..рыну якая бл..шчыць на сонцы *(у)* канцы сенажа*(ц)*ці. За рэчкаю с..седняя вёска і заходзіць за р..ку *(не,ня)* трэба гэта ўжо іншы забарон..*(н)*ны працяг.

Малая радзіма гэта тое што на ўсё жыццё адор*(ы)*вае нас крыламі на*(д,т)*хнен..я *(Паводле М. Капыловіча)*.

**Заданне 7.** Уважліва прачытайце, знайдзіце ў сказах памылкі. Запішыце выказванні ў адпаведнасці з нормамі сучаснай беларускай мовы. Назавіце прычыну парушэнняў.

*Максімальная колькасць балаў – 7.*

1) Ён збіраўся прыехаць да Новага года: к трыццатаму снежню. 2) На педагагічным савеце дырэктар ахарактарызаваў аб становішчы ў школе. 3) Ветэраны на шматлікіх прыкладах расказалі аб гераізме нашых воінаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. 4. За апошні час мы рабілі нямала, каб падрыхтавацца да алімпіяды. 5. Усе былі здзіўлены самому факту парушэнняў арфаграфічных норм у перыядычным выданні. 6. Вершы са зборніка маладога паэта – гэта заклапочанасць сучасніка над пытаннямі нашага жыцця.

**Заданне 8.** Вызначце правільныя сцвярджэнні, іх нумары абвядзіце кружком.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**1**. Рэалізм – мастацкі напрамак, які ў гісторыі літаратуры з'яўляецца пасля рамантызму; на першае месца вылучае тыповае як выражэнне заканамернага ў жыцці.

**2**. Асветніцтва – мастацкі напрамак у еўрапейскай літаратуры XVII – пачатку XIX ст., яго вызначалі высокая грамадзянскасць, строгае выкананне пэўных правіл (дзяленне жанраў на высокі і нізкія, інш.), арыентацыя на асветніцкія ідэалы Антычнасці.

**3**. Фарс – гумарыстычна перабольшаны спосаб карыкатурнага паказу дзеючых асоб.

**4**. Паэма-эпапея – жанр старажытнай літаратуры, які ў паэтычнай форме апавядае пра падзеі нацыянальнага, рэгіянальнага значэння, пра важныя гістарычныя падзеі, часам нават сусветнага маштабу.

**5**. Наступныя радкі Кастуся Кірэенкі напісаны трохстопным амфібрахіем:

*Якія прыгожыя людзі*
*Насустрач мне ўсюды ўстаюць,*
*Якія прыгожыя людзі*
*Мне рукі свае падаюць.*

**6**. Наступныя радкі Ніны Мацяш напісаны трохстопным анапестам:

*Шукайма цэнзара ў сабе.*
*Ён там жыве, дрымучы, без галення.*
*Ён там сядзіць, як чорцік у трубе,*
*і ціха пазбаўляе вас сумлення.*

**7**. Асананс – адзін з асноўных элементаў фонікі, заснаваны на паўторы падобных галосных гукаў: «Рана-раненька пчала / Пакідала вулей, / Заспявала-загула, / Каб усе пачулі».

**8**. Метафара – слова, якое ўказвае на пэўную прымету называемага прадмета.

**Заданне 9.** У прыведзенай табліцы знайдзіце ячэйкі (па гарызанталі), у якіх ёсць фактычныя памылкі. Ніжэй укажыце нумар гэтай ячэйкі і напішыце правільнае сцвярджэнне. У пустой ячэйцы пастаўце нумар малюнка (рымскімі лічбамі), які з'яўляецца ілюстрацыяй да адпаведнага твора.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| Назва твора | Аўтар | Жанравыя асаблівасці | Элементы характарыстыкі твора | Нумар малюнка |
|---|---|---|---|---|
| А. «Магіла льва» | 1. Янка Купала | 2. Рамантычная паэма | 3. Твор напісаны на аснове сапраўдных падзей, якія адбыліся ў XIII ст. на беразе Дняпра. | |
| Б. «Пінская шляхта» | 1. В. Дунін-Марцінкевіч | 2. Трагедыя | 3. У творы назіраецца відавочная сатырычная скіраванасць, высмейваецца абмежаванасць засцянковай шляхты. | |
| В. «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» | 1. Ян Баршчэўскі | 2. Цыкл апавяданняў, аб'яднаных пэўнымі кампазіцыйнымі законамі | 3. Зборнік быў напісаны на літоўскай мове. Аўтар імкнуўся пазнаёміць чытачоў з культурай простых людзей. | |
| Г. «Вечар» | 1. Янка Купала | 2. Меладрама | 3. Мастацкі час твора скіраваны часцей у мінулае. Героі, для якіх настаў вечар жыцця, наноў пераасэнсоўваюць пражытае. | |

| I | II |
|---|---|
|  |  |
| Мастак А. Кашкурэвіч | Мастак В. Славук |

| III | IV |
|---|---|
|  |  |
| Сцэна са спектакля рэжысёра В. Раеўскага | Сцэна са спектакля рэжысёра М. Пінігіна |

**Няправільныя сцвярджэнні:** ______________________________

______________________________

______________________________

А-☐ Правільнае сцвярджэнне: ______________________________

Б-☐ Правільнае сцвярджэнне: ______________________________

В-☐ Правільнае сцвярджэнне: ______________________________

Г-☐ Правільнае сцвярджэнне: ______________________________

**Заданне 10.** Аднавіце аўтарскі тэкст – выберыце з даведкі 5 слоў, ужытых у метафарычным значэнні, і ўпішыце іх у адпаведныя сказы. Пры неабходнасці змяняйце граматычныя формы слоў.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Вечарамі на зямлю ____________ шэрая ціш. Поле пахне аўсяным іржышчам і вялаю атаваю, а цесныя двары пры маўклівых хатах – коньмі і дзёгцем. Наша вуліца ____________ у цішы і ясным змроку. <...> Слаўна ____________ блізкая восень. Мякка ____________ зямлю празрыстая ноч. За дзве вярсты адсюль ____________ аеравай вастратою ад рэчкі, пажаўцелыя крушыны і каржакаватыя хвоі над ёю. Над паплавамі лазіць туман густым малаком...

*Паводле Кузьмы Чорнага*

**Даведка**: *цягнуць, гарэць, вучыцца, адчувацца, драмаць, абнімаць, лажыцца.*